# НОВЫ НАВУЧАЛЬНЫ БЯРЭ РАЗБЕГ

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 25 (647) Чацвер, 9 верасня 1966 года. Год выдання XIX. Цана 2 кап.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Інтэрв'ю даюць дэканы.

Святкаванне 21 гадавіны Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам.

Эйнштэйн і наш універсітэт.

Маршруты лета.

## ТВАЯ АЛЬМА МАТЭР

### ІНТЭРВ'Ю ДАЮЦЬ ДЭКАНЫ



— ПЕРШЫЯ ДНІ ЗАНЯТКАЎ, — запэўніў дэкан гістарычнага факультэта Пятро Захаравіч Савачкін, — прайшлі арганізавана, без зрываў. Узнёсла і ўсхвалявана прачыталі выкладчыкі лекцыі. Дарэчы, лекцыі па гісторыі заўсёды праходзяць цікава, студэнты іх слухаюць уважліва. Гэта сведчыць аб тым, што наша маладое пакаленне цікавіцца гісторыяй народаў, яго мінулым і сённяшнім. Ці не таму ў нас заўсёды вялікія конкурсы і залічваюцца студэнтамі на першыя курсы толькі тыя абітурыенты, якія атрымалі на экзаменах выдатныя адзнакі. Цяпер яны будуць вывучаць гісторыю СССР, гісторыю БССР, гісторыю старажытнага свету і сярэдніх вякоў, новую і навейшую гісторыю, гісторыю Камуністычнай партыі, палітычную эканомію, дыялектычны і гістарычны матэрыялізм і іншыя важныя галіны навукі, веды якіх неабходны для выпускніка факультэта — настаўніка сярэдніх школ.

Гісторыкі вельмі многа падарожнічаюць. Асабліва па Беларусі. За лета яны пабывалі ў розных кутках нашага краю. Сёлета, напрыклад, споўнілася 900 год старадаўняму беларускаму гораду Оршы. Студэнты — гісторыкі зрабілі там шмат важных даследаванняў па гісторыі горада, аб яго мужных людзях, аб Оршы—горадзе сённяшнім.

Студэнты факультэта маюць цесныя сяброўскія сувязі з гісторыкамі Ленінграда, Кіева Масквы, Вільнюса.

У гэтым годзе пры факультэце адкрыта новае аддзяленне — філасофскае. На першы курс яго залічана дваццаць пяць чалавек. Неўзабаве рэспубліка атрымае высокакваліфікаваныя кадры філасофаў.



ДАЛЕЙШАЕ РАЗВІЦЦЁ прамысловасці, яе мадэрнізацыя немагчымы без прымяненне матэматыкі. Расце і расце роля кібернетыкі, аўтаматычнага кіравання цэлымі вытворчымі працэсамі. Далейшае развіццё фізікі, хіміі, геаграфіі і многіх іншых галін навукі, — заўважыў намеснік дэкана матэматычнага факультэта Уладзімір Трафімавіч Воднеў, — увогуле немагчымы без цеснай сувязі з матэматыкай. Нельга цяпер недаацэньваюць важнасці матэматычных вылічэнняў, звязаных з палётам чалавека ў космас. Роля матэматыкі тут выключная.

На самым, што ні ёсць, высокім арганізацыйным і навуковым узроўні прайшлі першыя лекцыі. Асабліва ўважліва слухалі іх першакурснікі. Мы пасапраўднаму адчулі, што факультэт папоўніўся стараннымі, прагным да навукі папаўненнем. Ды на матэматычным факультэце, як і скрозь, старанна слухаць лекцыі і працаваць самастойна трэба з першага ж дня заняткаў, інакш нельга. Бо выпускнікі-матэматыкі накіроўваюцца на складаную працу ў вылічальныя цэнтры, у вышэйшыя навучальныя ўстановы, школы. Без глыбокіх, грунтоўных ведаў ім не працаваць.

Факультэт укамплектаваны выдатным прафесарска-выкладчыцкім калектывам. Усяму свету вядомы даследаванні ў галіне «Краявых задач» акадэміка АН БССР Ф. Д. Гахава, акадэмікаў АН БССР В. І. Крылова, М. П. Яругіна, Д. С. Супруненкі. Падрыхтаваў да абароны доктарскую дысертацыю В. П. Платонаў, шмат выкладчыкаў неўзабаве будуць абараняць кандыдацкія дысертацыі. Тэмы іх даследаванняў розныя: тэорыі груп, аналітычныя тэорыі дыферэнцыяльных ураўненняў і іншыя.

Ёсць вялікая і багатая база для самастойнай працы. Найбольш важныя даследаванні студэнтаў у галіне матэматыкі асвятляюцца ў друку, прадстаўляюцца на Усесаюзныя агляды навуковых студэнцкіх работ.

## ГОСЦІ УНІВЕРСІТЭТА

**Грамадскасць сталіцы, студэнты і выкладчыкі універсітэта прышлі на перон мінскага вакзала сустракаць сваіх сяброў, мужную моладзь В'етнама, якая прыехала да нас на вучобу.**

**Са жменямі кветак в'етнамскіх юнакоў і дзяўчат горача віталі сакратар камітэта камсамола універсітэта Г. Я. Рылюк, прарэктар універсітэта, герой Савецкага Саюза А. В. Кірсанаў, дэкан факультэта замежных студэнтаў К. К. Герман. У сваіх прамовах яны віншавалі пасланцоў мужнай краіны з гадавінай вызвалення В'етнама ад каланіяльнага прыгнёту. Ад моладзі В'етнама выступіў Нгут Гонг Бінь. Ён шчыра падзякаваў прысутных за цёплы прыём, падзяліўся сваімі ўражаннямі аб Савецкім Саюзе.**

**А сёння в'етнамскія юнакі і дзяўчаты ўжо слухаюць лекцыі, знаёмяцца з гісторыяй універсітэта, з жыццём таго чалавека, імя якога носіць Беларускі Дзяржаўны універсітэт.**

**А. КАЛАНТАЙ.**

* * *

*Тое, што наш універсітэт часта наведваюць замежныя госці, стала ўжо зусім звычайным.*

*Вось і нядаўна, 6 верасня, нас наведала група прадстаўнікоў маладзёжных арганізацый Лівана. Шаноўным гасцям была наладжана цёплая сяброўская сустрэча.*

*Як і ў якіх умовах жыве і вучыцца моладзь нашага універсітэта, вось што цікавіла маладых ліванцаў. Яны агледзелі універсітэцкія вучэбныя карпусы, аўдыторыі, кабінеты, актавую залу, бібліятэку. Затым у камітэце камсамола адбылася больш як двухгадзінная шчырая гутарка. Госці аказаліся надзвычай уражлівымі, усхваляванымі, шчырымі. Яны не паскупіліся расказаць і аб жыцці ліванскай моладзі. Тое, што ўбачылі і пачулі ліванцы, зрабіла на іх вялікі ўплыў. У канцы сустрэчы госці шчыра падзякавалі за цёплы прыём і пакінулі ў падарунак памятны сувенір.*

В. СІДАРОВІЧ.

## Новы корпус радыёфізікі і электронікі— падарунак Партыі і Урада студэнтам універсітэта



# НА ТРАСАХ ЛЕТА

Турысцкае падарожжа, бадай,—самы лепшы адпачынак. Любім падарожнічаць і мы, і замежныя студэнты нашага ўніверсітэта. І кожны раз, калі арганізуецца турысцкі поезд дружбы студэнтаў навучальных устаноў рэспублікі, палову вагонаў ці аўтобусаў займаюць студэнты БДУ імя Ул. І. Леніна.

Поезд дружбы, як першы вопыт, быў арганізованы яшчэ ў 1964/1965 навучальным годзе ў час зімовых канікул. Яго ўзначаліў Уладзімір Мухаеў. Тады студэнты наведалі горад—герой на Няве Ленінград, пабывалі ў яго музеях, на крэйсеры «Аўрора», у Петрапаўлаўскай крэпасці, у Разліве каля ленінскага шалаша, у цудоўных палацах культуры, любаваліся Неўскім праспектам. Таго ж года па гарадах і сёлах Беларусі і Літвы адправіўся аўтапоезд «Дружба». Студэнты пабывалі ў Оршы, Віцебску, Вільнюсе, Гродні, Брэсце, на новабудоўлях рэспублікі, у прыватнасці, на Полацкім нафтаперапрацоўчым заводзе. Былі арганізаваны экскурсіі на буйнейшыя прадпрыемствы рэспублікі, па месцах партызанскай славы.

Але самы масавы выезд быў гэтым летам, калі дапытлівыя падарожнікі—дзеці розных народаў—выехалі на сямі аўтобусах аўтапоезда «Дружба» па гарадах і сёлах Беларусі і братняй Украіны. Шматдзённы іх шлях ляжаў праз Горкі, Магілёў, Гомель, Чарнігаў да Кіева і праз Мозыр, Светлагорск, Бабруйск — назад. Аўтапоезд «Дружба» узначаліў супрацоўнік нашага універсітэта Ц. М. Старчанка. Вялікае ўражанне зрабілі на студэнтаў «Гомсельмаш», Беларуская сельгасакадэмія ў Горках. Упершыню ў праграму падарожжа было ўключана знаёмства з калгасамі. Асабліва цёплай была сустрэча ў калгасе «Чырвоная Змена» Любанскага раёна, непадалёку ад якога на востраве Зыслаў адбылося і знаёмства з былымі партызанамі на былым партызанскім аэрадроме. Студэнты пабывалі і ў піянерскіх лагерах, купаліся і каталіся на кацерах па Дняпры, Сожы, Прыпяці — буйнейшых беларускіх рэках.

Усюды выступалі з канцэртамі мастацкай самадзейнасці. У лагеры школьнага камсамольскага актыву «Арляняты» пад Магілёвам сыгралі нават у футбол, перамогшы гаспадароў поля з лікам 2:0.

Цёпла сустракалі нас і на гасціннай зямлі братняй Украіны. На граніцы чарнігаўцы паднеслі вялізны каравай, засыпалі аўтобусы кветкамі. Кіяўляне паказалі свае славутыя Крашчацік, Сафійскі сабор, Кіева—Пячэрскую Лаўру і іншыя мясціны сталіцы.

На ўсім шляху мы сустракалі сяброўскія ўсмешкі, моцныя поціскі рук, песні. Нельга забыць сяброў. І яны нашы песні напэўна будуць таксама помніць. Бо хіба хто забудзецца, як грымела песняй ўся зала ў кожным палацы Культуры, калі на сцэну з «Бухенвальдскім набатам» В. Мурадэлі выходзіў наш студэнт хімічнага факультэта кубінец Эстэбан Альфонса? І зноў жа тыя букеты кветак, якімі на ўсім шляху засыпалі нашы аўтобусы, іх не забудзем!

Самалійскія студэнты падрыхтоўчага факультэта універсітэта пакінулі такі запіс у кнізе аўтапоезда «Дружба»: «Мы, замежныя студэнты, з вялікім задавальненнем ішлі на сустрэчы з рабочымі фабрык і заводаў. Проста ля станкоў мы маглі пагутарыць, абмяняцца думкамі з савецкімі юнакамі і дзяўчатамі».

В'етнамскія студэнты ўсюды на вечарах інтэрнацыянальнай дружбы ад усёй душы дзякавалі вялікаму савецкаму народу за брацкую падтрымку і дапамогу ў барацьбе супраць амерыканскіх агрэсараў. Усе сустрэчы паміж моладдзю розных краін і кантынентаў праходзілі пад дэвізам дружбы і салідарнасці ў барацьбе супраць імперыялізма, капіталізма і неакаланіялізма за мір і сацыяльны прагрэс.

І кожны з нас у час гэтага цікавага і хвалюючага падарожжа яшчэ больш пазнаў і пасябраваў адзін з адным, яшчэ раз упэўніўся ў ненахіснасці нашай юнацкай дружбы і салідарнасці.

І кожны гатоў рушыць зноў у дарогу па новых трасах дружбы.

**Ул. ГАЛАЙША.**

# ТВАЯ АЛЬМА МАТЭР

## *ІНТЭРВ'Ю ДАЮЦЬ ДЭКАНЫ*

**ПРАЦА ЮРЫСТА ВЕЛЬМІ** адказная. Трэба быць спрактыкаваным, мець вялікі жыццёвы вопыт, каб кваліфікавана разабрацца ў складаных судовых справах. Юрыст павінен набыць выдатную агульнаадукацыйную падрыхтоўку. Таму выключнае значэнне мы надаем вывучэнню грамадскіх навук, вучэнню Маркса, Энгельса, Леніна, гісторыі Камуністычнай партыі, навуковага камунізма, марксісцкай філасофіі, гісторыі палітычных вучэнняў, дзяржаўнага права краін народнай дэмакратыі, дзяржаўнага права буржуазных краін, асноваў рымскага дзяржаўнага права і іншаму.

Да гэтага года ў прыёме на вучобу на наш факультэт былі некаторыя абмежаванні. Здаваць уступныя экзамены дазвалялася толькі абітурыентам-стажнікам. Сёлета дваццаць працэнтаў паступаючых былі школьнікі. Гэта дало мажлівасць у конкурсным адборы выбраць найбольш адукаваную і здольную вучыцца на нашым факультэце моладзь. У наступныя гады працэнтная колькасць выпускнікоў школ будзе яшчэ больш павялічана.

У сувязі з запатрабаваннямі сельскай гаспадаркі ў кадрах у гэтым годзе пры факультэце адкрыта новае аддзяленне — эканамічнае. Яно падрыхтуе спецыялістаў для юрыдычных службаў калгасаў і саўгасаў рэспублікі.

Для паслуг студэнтаў на факультэце ёсць спецыяльная бібліятэка, лабараторыя крыміналістыкі і чатыры вучэбныя лабараторыі, але яны не могуць задаволіць усе запатрабаванні студэнтаў, многае абсталяванне іх устарэла, у нездавальняючым становішчы знаходзіцца і іншая вучэбная база. Часта бываюць зрывы заняткаў па крымінальнаму праву, і ўсё з-за таго, што няма дзе праводзіць практычных заняткаў. Зусім мала новага абсталявання. Цяпер мы перайшлі ў галоўны корпус, для крыміналістыкі вылучылі дзве новыя аўдыторыі. Становішча крыху выправілася.



Што датычыцца пажаданняў студэнтам, скажу адно: юрысту штодзённа трэба вучыцца і вучыцца, развіваць і пашыраць сваё разуменне грамадства. Бачыць яго цяперашняе жыццё і перспектывы на будучае, займацца больш навуковымі даследаваннямі ў студэнцкіх гуртках. Прафесарска-выкладчыцкі калектыў у нас выдатны, і ён заўсёды прыдзе на дапамогу студэнтам. Вось факты, якія сведчаць аб росце выкладчыцкіх кадраў на факультэце: доктарскую дысертацыю абараніў І. І. Гарэлік, двум дактарам навук было прысвоена прафесарскае званне. Паспяхова працуюць над доктарскімі В. Ф. Чыгір, М. Г. Юркевіч, І. С. Цішкевіч і іншыя.



**ІВАН ПАЎЛАВІЧ ЗЯЦЬКОЎ,** дэкан фізфака, гасцінна запрасіў паглядзець новыя аўдыторыі, іх 33. Дзве паточныя на 220 месц. На твары дэкана незвычайная ўрачыстасць, хваляванне. Фізічны факультэт ператварыўся ў цэлы інстытут—на ім займаецца зараз 1800 студэнтаў стацыянара. Шмат прыходзіць на вучобу і вечарам моладзі з фабрык і заводаў сталіцы.

— Выдатнае папаўненне прышло да нас з Гарадзейскай фізіка-матэматычнай школы Нясвіжскага раёна. Большасць абітурыентаў гэтай школы паказала на ўступных экзаменах выдатныя веды. Да нас часта прыязджаюць настаўнікі пацікавіцца, як лепш падрыхтаваць школьнікаў да паступлення ва універсітэт. Вопыт падрыхтоўкі выпускнікоў Гарадзейскай СШ трэба пераняць і іншым фізіка-матэматычным школам. Абітурыенты 50 школы Мінска такога ж профілю ведалі ўраўненні Эйнштэйна, але не змаглі адказаць на элементарныя пытанні фізікі і матэматыкі.

Паступіць вучыцца на наш факультэт цяжка. Вось некаторыя прыклады: на радыёфізіку паступала 230 медалістаў, прайшло па конкурсу толькі 105; на фізіку—263 медалісты, а паступіла толькі 117, 28 абітурыентаў здалі экзамены на выдатна, 116 атрымалі толькі па адной чацвёрцы. Гэта вельмі моцны кантынгент першакурснікаў, а іх залічана нямала—450 на стацыянарнае навучанне і 150 на вячэрняе.

Вядома, што выхаванне такога калектыву патрабуе вялікіх намаганняў прафесарска-выкладчыцкага складу. Вопыт, праўда, у нас ёсць вялікі. Маладым кадрам і студэнтам ёсць у каго павучыцца. Выдатна чытаюць лекцыі такія буйныя вучоныя краіны, як прафесары А. Н. Сеўчанка, В. Г. Вафіядзі, І. Р. Некрашэвіч і многія іншыя.

У гэтым годзе будзе працаваць кафедра радыё-тэхнікі. Намечана раздзяленне факультэта на два—на фізічны і радыёфізічны, у бліжэйшыя гады будзе заснавана яшчэ некалькі новых кафедраў.

Лабараторыі абсталяваны цудатэхнікай, тут створаны выключныя ўмовы для самастойнай работы студэнтаў.

Нядаўна мы атрымалі гелевую ўстаноўку для атрымання гелія. Раней Беларусь не мела яе. Цяпер у нас будзе «свой» гелій, і мы зможам паспяхова вырашыць праблему атрымання нізкіх тэмператур.

— Адным словам, выдатнае ў нас цяпер усё, — працягвае Іван Паўлавіч, — але стаць самому па сабе фізікам немагчыма. Трэба працаваць па 14 гадзін у суткі і ніяк не менш. Праграма навучання складаная, ёю наскокам не авалодаеш. Меней трэба гуляць, больш уважліва слухаць лектара, пільна сачыць за лабараторнымі вопытамі. Ніколі не трэба забывацца аб адказнасці стаць фізікам універсітэта. Вытворчасць не церпіць абібокаў, а стрыманыя, мэтанакіраваныя і высокакваліфікаваныя фізікі прабіваюцца праз усе цяжкасці на шырокі шлях жыцця.

Прывяду такі прыклад. Неяк сустрэў я выпускніка нашага факультэта.

— Дзе працуеце, як жывяце?

А ён мне пра завод расказвае...

Неяк спачатку і не верылася, што чалавек усяго два-тры гады, як закончыў універсітэт, а ўжо стаў вядучым інжынерам. Радасна за такіх выпускнікоў. Яны працуюць у вылічальных цэнтрах, канструктарскіх бюро, начальнікамі цахоў.

Да 50-годдзя Савецкаў улады выкладчыкі ўзялі высокія абавязацельствы — падрыхтаваць 50 кандыдатаў навук. У гэтым годзе абаранілася ўжо сем.

лічваць усе прадпрыемствы хіміі рэспублікі, якія выпрабляюць штучныя валокны. Бо ні для каго няма сакрэту ў тым, што наша рэспубліка становіцца краем вялікай хіміі. Мы з упэўненасцю можам сказаць, што ўсе галіны вытворчасці будуць забяспечаны намі кваліфікаванымі кадрамі..

Як бачыце, я шмат гавару пра хімію. Але без вывучэння грамадскіх навук — гісторыі партыі, навуковага камунізма, марксісцкай філасофіі,—без ведання ўсяго гэтага нельга ўявіць сабе сённяшняга хіміка. Таму вывучэнню гэтых дысцыплін у нас надаецца вялікая ўвага.

Жыццёвы шлях хіміка—гэта шлях штодзённых пошукаў, новых каштоўных адкрыццяў. Таму студэнту нашага факультэта, ці то ён першакурснік, ці старшакурснік, трэба брацца за вучобу з першага ж дня, асабліва за даследаванні ў лабараторыях.

У сувязі з пошукамі і адкрыццём нафты ў рэспубліцы на хімфаку створана новая спецыялізацыя—хімія нафты. Узначальвае падрыхтоўку па гэтай спецыяльнасці прафесар Д. М. Андрыеўскі.

Перспектывы развіцця хімфака, бачыце, неабсяжныя. А такія нашы вучоныя, як І. П. Цішчанка і В. В. Свірыдаў, хутка закончаць важныя даследаванні і абароняць доктарскія дысертацыі. Супрацоўнікі кафедры неарганічнай хіміі падрыхтавалі «Зборнік задач па неарганічнай хіміі», які атрымаў высокую ацэнку грамадскасці. Ф. М. Капуцкі рыхтуе «Дапаможнік для паступаючых у вну». Працуюць над кнігамі і іншыя вучоныя факультэта.

*НА СТАЦЫЯНАРНАЕ навучанне на наш факультэт, — расказвае в. а. дэкана біялагічнага факультэта Анатоль Цімафеевіч Пікулёў, — залічана 175 студэнтаў, 50 на вячэрняе і 100 на завочнае. Гэтыя лічбы на многа перавышаюць мінулагодні прыём. На першых занятках прысутнічала 100 працэнтаў студэнтаў. Да лекцый старанна падрыхтаваліся ўсе выкладчыкі. Яны чыталі ўзнёсла, кваліфікавана, прыводзілі многа прыкладаў з жыцця.*

*Спецыялістаў факультэт рыхтуе ў галіне біяфізікі, біяхіміі, генетыкі, цыталогіі, мікрабіялогіі, вірусалогіі і многіх іншых.*

*Праходзіць тэхнізацыя біяфака, яго сувязі з хіміяй, фізікай і матэматыкай. Нядаўна створана новая навукова-даследчая лабараторыя. Як вядома, 9 студзеня 1963 года была вынесена Пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па далейшаму развіццю біялагічнай навукі і ўмацаванню яе сувязі з практыкай». Гэтая Пастанова і яе Дырэктывы далі для нас шмат новых накіраванняў у рабоце. Мы ў некаторых галінах біялагічнай навукі, на кафедрах у многім перабудавалі свае планы, каб яшчэ цясней ісці з жыццём, з запатрабаваннямі прамысловасці. І ў гэтым мы ўжо маем вялікія поспехі. Штогод на факультэце павялічваецца і павялічваецца колькасць навуковых студэнцкіх работ, якія на Рэспубліканскіх аглядах займаюць першае ці другое месцы. Асабліва старанна над даследаваннямі працавалі студэнты кафедры беспазваночных В. Піскуноў, кафедры біяхіміі і біяфізікі І. Даўгелевіч, М. Марозік. У гэтым годзе яны закончылі навучанне і пакінуты на вучобу ў аспірантуры.*

*Кандыдацкія дысертацыі абаранілі Т. А. Рабушка, Г. І. Марцынкевіч. В. Ф. Цераховіч. Многія выкладчыкі падрыхтавалі да абароны кандыдацкія дысертацыі. Тэмы іх даследаванняў надзённыя —сілкаванне і рост раслін, селекцыя важнейшых сельскагаспадарчых культур, хвароба сельскагаспадарчых раслін і распрацоўка мер для барацьбы з захворваннямі, біялагічная і прамысловая прадукцыйнасць вадаёмаў, пытанні сельскагаспадарчай і медыцынскай мікрабіялогіі і вірусалогіі і многія іншыя.*



*Важна адзначыць і тое, што большасць даследаванняў студэнтаў, аспірантаў і выкладчыкаў укараняецца ў вытворчасць. Гэта нас заве на новыя творчыя пошукі і адкрыцці ў навуцы.*

# ВЕЧАР ДРУЖБЫ

## *Урачыстасці ва універсітэце в'етнамскіх і савецкіх студэнтаў і выкладчыкаў з выпадку 21 гадавіны Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам*

*Наш універсітэт, як і ўся наша краіна і прагрэсіўнае чалавецтва, урачыста адзначыў 21 гадавіну Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам. Сёння ўсе ведаюць гэтую гераічную краіну, яе мужны народ. Для народаў зямлі барацьба, якую вядзе В'етнам супраць амерыканскіх імперыялістаў, стала сімвалам непахіснай волі ў барацьбе за свабоду і незалежнасць.*

*Днямі ў актавай зале галоўнага корпуса універсітэта адбыўся вечар, прысвечаны юбілею слаўнай краіны. Ва ўрачыстых абставінах прадстаўнікі грамадскасці і студэнты віталі групу в'етнамскай моладзі, якая прыехала на вучобу ў наш універсітэт.*

*Гучаць гімны В'етнама, Савецкага Саюза і Беларусі. На трыбуне в'етнамскі студэнт Н. Дж. Вінь. Ён падрабязна спыняецца на дасягненнях краіны за 21 год. Пад воплескі прамоўца гаворыць аб сённяшняй барацьбе в'етнамскага народа за незалежнасць. Тыя зверствы, якія ўчыняюць амерыканскія ваякі у нашай краіне, — гаворыць Вінь, — яшчэ больш узмацняюць нашу справядлівую барацьбу. Ёсць шмат прыкладаў, якія з'яўляюцца яскравым сведчаннем таго, што мы ніколі і ні перад чым не адступім. Мы паўсядзённа адчуваем вялікую маральную і матэрыяльную падтрымку прадстаўнікоў прагрэсіўнага чалавецтва і перш за ўсё краін сацыялізма. Н. Дж. Вінь гаворыць удзячныя словы нашаму савецкаму народу, эканамічную дапамогу якога цяжка пераацаніць.*

*«Мы, афрыканскія народы, асаблива рады за поспехі В'етнама ў яго барацьбе, мы бяром прыклад, як трэба змагацца за свабоду, — гаворыць студэнт другога курса біяфака Кейе. — Ведайце, таварышы, з вамі ўся дэмакратычная моладзь. І будзе час,— заключае Кейе, — мы ў гэтым упэўнены, Паўднёвы і Паўночны В'етнам будуць аб'яднаны».*

*Цёпла сустрэлі прысутныя студэнтаў з Вострава Свабоды. «Нам, кубінцам, — гаварылі яны, — добра вядома злачынная палітыка імперыялістаў ЗША. Мы заўсёды гатовы дапамагчы ў справядлівай барацьбе в'етнамскаму народу».*

*Студэнтка філалагічнага факультэта Тамара Скудная гаварыла аб тым хваляванні, з якім сочыць савецкі народ за падзеямі ва В'етнаме. «Мы з вамі, дарагія в'етнамскія браты! Мы супроць таго, каб гарэла твая зямля, В'етнам, каб ліліся на ёй слёзы твайго народа. Мы будзем змагацца за тое, каб твая зямля цвіла мірнай працай і шчасцем. Толькі братняя моцная дружба і згуртаванасць усіх міралюбівых народаў можа стрымаць агрэсіўныя планы імперыялістаў».*

*Пасля ўрачыстай часткі быў цікавы канцэрт, падрыхтаваны в'етнамскімі студэнтамі.*

*А. СВОРАБ.*



З гісторыі універсітэта

З гісторыі універсітэта

# ЭЙНШТЭЙН І БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Усяму свету вядома імя найбуйнейшага фізіка Альберта Эйнштэйна (1879—1955). Законы, адкрытыя ім, ляжаць у аснове сучаснай фізікі і матэматыкі. Альберта Эйнштэйна Ул. І. Ленін назваў «вялікім пераўтваральнікам прыродазнаўства». У 1927 годзе ён быў выбраны ганаровым членам Акадэміі навук СССР. Але мала каму вядома, што гэты вялікі вучоны меў сяброўскія сувязі з беларускімі вучонымі і, у прыватнасці, з Беларускім дзяржаўным універсітэтам. Пра гэтыя сувязі нам расказваюць некаторыя дакументы, якія захоўваюцца ў Цэнтральным дзяржаўным архіве БССР і ў фондзе Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна.

Да 1933 года Эйнштэйн жыў і працаваў у Берліне, дзе ён быў дырэктарам фізічнага інстытута і прафесарам універсітэта. З 1915 года разам з ім працаваў яго вучань Якаў Громер—буйнейшы вучоны-матэматык, які нарадзіўся ў 1879 годзе ў Брэсце, але вучыўся за граніцаю, дзе скончыў фізіка-матэматычны факультэт Гетынгенскага універсітэта.

З Эйнштэйнам і яго вучнямі беларускія вучоныя мелі навуковыя сувязі. У той час фізіка-матэматычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага універсітэта мела патрэбу ў вопытных кадрах. Пакуль яшчэ невядома, калі і якім чынам завязаліся сувязі універсітэта з вучнем Эйнштэйна—Я. Громерам. Але 28 ліпеня 1928 года на пасяджэнні праўлення Белдзяржуніверсітэта разглядалася заява доктара Громера аб прадстаўленні яму кафедры па матэматыцы. Да заявы быў прыкладзены даволі цікавы водгук самога Эйнштэйна. Вось яго змест:

«Доктар Громер з'яўляецца адным з самых вопытных вучоных па аналітычнай матэматыцы, а таксама вопытным па пытанні адноснай тэорыі; на апошнім полі дзейнасці ён працаваў разам са мною больш дзесяці гадоў.

Асабіста доктар Громер вельмі адданы ідэалу, да якога імкнецца рускі народ і рускі ўрад і да якога ён заўсёды блізка стаяў. Ён, напэўна, аддасць усе свае сілы, каб служыць даверанай яму вучонай службе. А. Эйнштэйн».

Па рэкамендацыі Эйнштэйна Якаў Громер быў залічаны прафесарам БДУ па кафедры матэматыкі з 1 студзеня 1928 года. У лістападзе таго ж года ён пераехаў з Берліна ў Мінск і працаваў тут да смерці ў красавіку 1933 года.

Пра сувязі Альберта Эйнштэйна з Белдзяржуніверсітэтам гаворыць і такі факт. У сакавіку 1929 года навуковая грамадскасць адзначала 50-годдзе вялікага вучонага. У сувязі з гэтым фізіка-матэматычная секцыя Навуковага таварыства пры БДУ павіншавала Эйнштэйна з яго 50-гадовым юбілеем і пажадала яму далейшых поспехаў у навуцы. У адказ на гэта вучоны прыслаў вершаваны твор, поўны чуласці і вясёлага гумару. У адной з мінскіх газет у той час ён быў надрукаваны ў перакладзе на беларускую мову:

«Кожны сёння выяўляе
Ўсю прыхільнасць да мяне;
Піша друг з чужога краю,
Блізкі —ў роднай старане.
Мне жадаюць асалодаў,
Як гуллівым юнаком,
— Ці ж старому дасць прырода
Карыстацца так жыццём?
А гучаць прыемным хорам
Прывітанні ў гэты дзень,
Аздабляючы ўборам
Ясных фарбаў—змрок і цень.
Гэта безліч выхваленняў,
Гэты светлы арэол
Надаюць мне шмат натхнення
— Я ўзнёсся, як арол.

Дзень канчаецца вясёлы;
Шлю сваю падзяку ўсім;
Ззяе разам з нашым колам
Сонца—смехам залатым!

З прыяцельскай падзякай ваш
А. Эйнштэйн».

Вядома, што Эйнштэйн вельмі любіў музыку і добра іграў на скрыпцы. Але аказваецца, што ён таксама пісаў і вершы. На жаль, арыгінала гэтага верша ў архіўных фондах не захавалася. Але тое, што ёсць, мае вялікую цікавасць. Яно адкрывае невядомыя да гэтага часу некаторыя старонкі жыцця і дзейнасці вялікага вучонага.

**М. КАМІНСКІ.**

(«Літаратура і мастацтва» № 19 1965 г.)

Рэдактар А. ЛОЙКА.

# ВАРВАРА ФЁДАРАЎНА КРЫЎЧЫК

**6 верасня раптоўна памёрла Варвара Фёдараўна Крыўчык, дацэнт кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства, адзін са старэйшых работнікаў нашага універсітэта. Ад нас адыйшоў чулы таварыш і вопытны педагог, які самаадданa любіў сваю справу.**

**Варвара Фёдараўна Крыўчык прайшла вялікі і цяжкі жыццёвы шлях ад работніцы шаўковай фабрыкі да выкладчыка і навуковага работніка адной з кафедраў універсітэта.**

**У 1938 годзе Крыўчык паступіла на літаратурны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута. Вялікая Айчынная вайна перарвала вучобу. Першыя гады вайны Варвара Фёдараўна працавала ў адной з сельскіх школ Башкірскай АССР. Затым яна прадаўжала займацца філалогіяй ужо ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Пры ім у 1948 годзе яна скончыла аспірантуру і паспяхова абараніла кандыдацкую дысертацыю.**

**З 1948 года і да дня смерці В. Ф. Крыўчык працуе ў нашым універсітэце, вядзе вялікую педагагічную і навуковую працу. Выдатны знаўца беларускай, рускай і іншых славянскіх моў, Варвара Фёдараўна чытала лекцыі па стараславянскай мове і выкладала польскую мову студэнтам і аспірантам. Увесь вольны ад лекцыйных заняткаў час Варвара Фёдараўна прысвячала навукова-даследчай працы ў галіне граматыкі і лексікі беларускай мовы. Шматлікія артыкулы і раздзелы вучэбных дапаможнікаў, напісаныя В. Ф. Крыўчык— гэта значны ўклад у славянскае мовазнаўства.**

**В. Ф. Крыўчык горача любіла моладзь, і моладзь адказвала ей такімі ж шчырымі пачуццямі. Сваёй высокай прынцыповасцю, непрымірымасцю да якіх бы там ні было недахопаў, вялікай працавітасцю В. Ф. Крыўчык здабыла глыбокую павагу ўсяго педагагічнага калектыву. Памяць аб Варвары Фёдараўне Крыўчык назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.**

**ДЭКАНАТ, ПАРТБЮРО, КАМІТЭТ КАМСАМОЛА І ПРАФБЮРО ФІЛАЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА, КАФЕДРА АГУЛЬНАГА І СЛАВЯНСКАГА МОВАЗНАЎСТВА.**

АТ 01956. Адрас рэдакцыі: г. Мінск, БДУ імя Ул. І. Леніна, галоўны корпус, п. 212, тэл. 2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. № 1130